АГЕЕЎ А. Р. (Магілёў
педінстытут)

# Справа гімназіста Льва Пятроўскага, як крыніца асвятлення грамадска-палітычнага жыцця 30-х гадоў XIX стагоддзя

Трыццатыя гады XIX стагоддзя ў гісторыі Беларусі традыцыйна асвятляліся ў савецкай гістарыяграфіі як перыяд рэакцыі, нават змрочнага цемрашальства, які надышоў пасля падаўлення ў Расіі паўстання дзекабрыстаў у 1825 г. і яшчэ больш узмацніўся пасля няўдачы паўстання 1830—1831 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі. Але ў апошні час пэўныя колы расійскай грамадскасці пачалі рух па ўшанаванню, а нярэдка і па ўпрыгожванню і абяленню сваёй дарэвалюцыйнай гісторыі. Перш-наперш гэта датычыцца часоў праўлення дынастыі Раманавых. Руплівa зафарбоўваюцца плямы ў яе гісторыі, праз сродкі масавай інфармацыі ствараюць вобраз ледзь не райскага, лагоднага жыцця ў тыя часы. Дзе ж ісціна? Нязначныя па сваёй сутнасці падзеі, якія адбыліся ў Магілёўскай гімназіі ў 1837 г., красамоўна ілюструюць дух той эпохі і дазваляюць часткова адказаць на гэта пытанне.

Сутнасць падзеі: 13 сакавіка 1837 г. інспектар гімназіі выпадкова знайшоў напісаны па-польску верш вучня пятага класа двараніна Льва Пятроўскага шкодлівага зместу. Ужо 15 сакавіка Пятроўскі быў рашэннем Савета гімназіі выключан, як «нядобранадзейны, які можа заразіць і іншых выхаванцаў». Гэта было зроблена нягледзячы на тое, што раней за выдатную вучобу і прыкладныя паводзіны Пятроўскаму была прызначана стыпендыя. У канцы сакавіка справа ўжо разглядаецца на ўзроўні генерал-губернатара і кіраўніцтва Беларускай вучэбнай акругі (дарэчы, назва Беларусь, беларускія будуць праз 3 гады заменены).

Што ж так усхвалявала афіцыйныя колы? Змест верша, безумоўна, выходзіў за межы дазволенага гімназісту. У ім, у прамой форме выказвалася падтрымка польскаму вызваленчаму руху, нядобра паміналася «родам з ада» імператрыца



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Кацярына. 20 радкоў тэкста, які Пятроўскі спачатку прызнаў уласным творам, а потым стаў сцвярджаць, што знайшоў яго ў Чавусах і толькі перапісаў, усё ж выглядаюць нязначнымі для разглядання на такім высокім узроўні. У іншых вучняў крамолы знойдзена не было. Гэты выпадак безумоўна сведчыць аб тым, што вольналюбства і незадаволенасць сярод моладзі былі жывы, нягледзячы на рэпрэсіі. Але аднесці яго да падзей рэвалюцыйнага руху не змагла ні царская бюракратыя, ні нават савецкая гістарыяграфія, якая ўпарта шукала рэвалюцыйныя з'явы ў дасавецкім часе.

Перш наперш, мы бачым моц і слабасць бюракратычнай машыны Расійскай імперыі. Улада імкнулася пільна сачыць за светапоглядам сваіх падданых, стварае даволі эфектыўную сістэму нагляду, але ж сама і пакутвае ад гэтага. Кідаецца ў вочы нежаданне чыноўнікаў прымаць на сябе адказнасць за тое ці іншае рашэнне, бо змест вершаў рабіў справу афіцыйнай. Усім бачна дробнасць з'явы, але і занадта літасным ніхто выглядаць не хацеў. Усе імкнуцца падстрахавацца. Бачны дубляж функцый. Адсюль і вялікія тэрміны разбора справы, і шматлікасць папер, якія ў рэшце склалі вялікі том. Які захоўваецца ў ЦДГА Беларусі.— ф. 3157, 0,1, с. 289. Па сутнасці рашэнне было знойдзена толькі ў царскай канцэлярыі, дзе «по соизволению» каранаванай асобы (!), улічваючы дваранскае сацыяльнае становішча было дазволена маці гімназіста па яе меркаванню і без сведкаў пакараць яго. У рэшце рэшт, Пятроўскаму амаль праз 2 гады пасля шматлікіх хадайніцтваў маці ў самыя высокія інстанцыі дазволена працягваць вучобу «пад наглядам» у Віцебскай гімназіі.

Гэта справа красамоўна малюе тую атмасферу ідэалагічнага ціска, падаўлення ў самым зародзе іншадумства, вольналюбства, нацыянальнай самасвядомасці, якая панавала ў сістэме адукацыі Расійскай імперыі ў 30 гады XIX ст. Менавіта ў гэты час быў закрыт Віленскі універсітэт, узмоцнена цэнзура, паліцэйскі кантроль за вучэбнымі ўстановамі. Безумоўна, гэта эпоха не так змрочна і безнадзейна, але прыведзены намі прыклад нагадвае, што многія вывады савецкай гістарыяграфіі грунтуюцца на дакументальным падмурку і іх не трэба пакідаць па-за ўвагай.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова